## Паветра для пачатку

### Выхаванцы Арт-цэнтра «Вулей» у Смілавічах прысвяцілі творы Манюшку

У іх адна радзіма. І яны таксама захопленыя творчасцю. Юныя мастакі з «Вулля», што існуе ў Смілавічах, прысвяцілі выстаўку свайму славутаму земляку, якую можна пабачыць у Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры. «Станіслаў Манюшка: музыка ў душы і вобразах» — гэта тэма важная не толькі ў юбілейны год кампазітара. Для дзетак з «Вулля» яна актуальная па азначэнні, бо блізкі ён для іх, свой, хоць і два стагоддзі прайшло. А мясціны тыя ж, паветра... І хоць няма ўжо ні сядзібы Манюшкаў, ні касцёла ў Смілавічах, дзе хрысціў будучага кампазітара, застаўся парк і рэшткі палаца, дзе Станіслаў гасцяваў у дзяцінстве ў свайго дзядзькі, каб потым прыгадваць мінулыя дні ў оперы «Страшны двор». Смілавіцкі палац зараз рэстаўруецца, адзіны ў свеце музей кампазітара перабраўся з Убеля ў Смілавічы. Цяпер сюды можна хадзіць з экскурсіямі, слухаць музыку...

Навучэнцы Арт-цэнтра, якім кіруе Алена Карнеенка, натхніліся такой экскурсіяй, вырашылі выказаць свае адчуванні ад творчасці і лёсу Манюшкі. Хтосьці стварыў партрэты самога кампазітара, хтосьці — краявіды яго радзімы. 17 выхаванцаў «Вулля» ўславілі земляка праз алейны жывапіс, графічныя тэхнікі, лямец. Агульнымі намаганнямі ўсіх удзельнікаў была ўвасоблена мастацкая прастора кампазітара.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Музыка

## Спадчына — гэта гучыць

Балеты «Альпійская балада», «Маленькі прынц» і «Тыль Уленшпігель», опера «Майстар і Маргарыта», шэсць сімфоній, «Палеская сюіта» і «Беларуская рапсодыя», урачыстыя маршы, лірычныя інструментальныя п'есы, танцы і гумарэскі, а яшчэ песні для ўпадабаных гледачамі спектакляў і кінастужак «Беларусьфільма» — творчая спадчына народнага артыста СССР і БССР, кампазітара Яўгена Глебава насамрэч неабсяжная.

Нават без усякіх памятных дат творы Глебава гучаць, жывуць і застаюцца запатрабаванымі ў мноства выканаўцаў і шырокай публікі. Сёлета ж да 90-годдзя з дня нараджэння Яўгена Глебава і Года малой радзімы Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі зладзіла па ўсіх рэгіёнах вялікі гастрольна-канцэртны тур, які з 1 да 10 верасня праходзіць на адкрытых пляцоўках ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі. Памяць прафесара, які аддаў амаль 30 гадоў жыцця працы ў Акадэміі музыкі, ушаноўвае студэнцкі духавы аркестр пад кіраўніцтвам дырыжора, дэкана аркестравага факультэта Максіма Расохі.

У прыватнасці, учора канцэрт у фармаце опэн-эйру адбыўся на плошчы зорак у Магілёве, 8 верасня музыка Глебава будзе гучаць на Білецкім спуску ў Гомелі (пачатак канцэрта а 17-й гадзіне), а фінішнай кропкай творчага праекта стане плошча Свабоды ў Мінску (канцэрт у Верхнім горадзе пачнецца з 20.30).

Творчы праект «Музычная спадчына Радзімы», падтрыманы Міністэрствам культуры і ўсімі абласнымі і гарадскімі выканаўчымі камітэтамі, рэалізаваны за кошт сродкаў гранта спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

Літаратура

# НІЧОГА НЕ ЗАСТАЕЦЦА, ЯК СТАЦЬ ГЕНІЕМ...

**Як вядома, на Дні беларускага пісьменства ў Слоніме былі аб'яўлены вынікі конкурсу «Нацыянальная літаратурная прэмія 2019». Пераможцам у намінацыі «Найлепшы твор прозы» стала кніга вядомага пісьменніка Алега Ждана (Пушкіна) «Геній». Алег Аляксеевіч — супрацоўнік нашага холдынга, рэдактар аддзела прозы часопіса «Нёман».**

**З пераможцам літаратурнага конкурсу гутарыць карэспандэнт «Звязды».**

***— Над чым вы зараз працуеце?***

— Мне часта задаюць гэтае пытанне, як быццам пісьменнік на самай справе не можа пражыць ні дня без радка («ни дня без строчки»). Думаю, нават Пліній Старэйшы, які і нарадзіў гэтае крылатае выслоўе, дазваляў сабе расслабіцца перад новай работай. Я зараз таксама расслабіўся, бо толькі што закончыў новае апавяданне (ці невялікую аповесць) «Малітва» — пра пісьменніка. Летась я таксама напісаў апавяданне «Апошні сябра» — пра рэдактара вялікага літаратурнага часопіса, аб спецыфічных прафесійных і асабістых праблемах людзей гэтай прафесіі. Работа рэдактара цікавая, але часам вельмі няўдзячная, гэта я ведаю па сабе. У большасці выпадкаў аўтары прымаюць заўвагі і прапановы, а вось на днях я атрымаў пісьмо-абвінавачанне, падпісанае імем Ала Жураўская. Цікава, што з адрасу заблакаваным зваротным адрасам. Не пажадала дзяўчына браць адказнасць за свае словы.

Але гэта выключэнне. Работа ў рэдактара зусім не простая: з кожным рукапісам патрэбна разабрацца. Гэта значыць, уважліва прачытаць, абдумаць, прыняць рашэнне...

У «Малітве» ж размова ідзе пра маладога літаратара, яго асабістае жыццё, творчасць і некаторыя болевыя кропкі нашага агульнага быцця.

***— Што ў літаратурных планах на далейшае, Алег Аляксеевіч? Памніцца, вы планавалі напісаць вялікі твор пра сваю маці. Тэма наколькі ўдзячная, настолькі і складаная.***

— Так, планаваў, дакладней — спадзяваўся, што змагу. Раман называецца б «Вера» — гэта і імя маці, і душэўны стан чалавека. Дваццаць гадоў мінула з таго часу, як маці пайшла, а я да гэтага часу адчуваю віну перад



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ёю. Напрыклад, за тое, што памерла без мяне. І не толькі. Хоць, думаю, я быў нядрэнным сынам. У думках вяду размову з ёю, віню сябе і апраўдваюся. Нават адчуваю патрэбу пакаяння. Перад кім? Хіба што перад яе магілай у Мсціслаўе.

Што датычыцца рамана... На дзясятай старонцы спыніўся, і — ні з месца. Нешта памылковае аказалася ў самой задумцы. Відаць, для рамана пакаянне не можа быць такой магутнай ідэяй.

***— А ці геній герой аповесці, якая дала назву зборніку?***

— Гэтае пытанне таксама часта мне задаюць. Але я не ведаю. І наогул размова ў аповесці не пра тое. Героя майго завуць Трыфан, Трышка, ён адзін на ўсёй зямлі, ні сябра, ні хоць бы прыяцеля, ні жанчыны. Нават маці не хоча ці не можа зразумець яго надзеі і імкненні. Яму нічога не застаецца, як у адзіноцтве верыць у сваю зорку. І нават скажу так: нічога не застаецца, як стаць геніем. Ён мастак, шукае свой шлях, не жадае прытрымлівацца нейкіх узораў. А неразуменне з боку адзінага блізкага чалавека — маці — успрымае як здраду.

Але вось апошнія думкі пра маці, якая памерла, апошні абзац аповесці: «...Напіша (ён напіша) што-небудзь сапраўды простае і харошае, толькі для таго, каб пацвердзіць яе веру: ён — Геній. І яшчэ дзеля таго, каб сустрэцца з ёю ў новым жыцці».

***— Адукаваны чытач ведае вашы раманы «Князь Мсціслаўскі», «Гасударыня і епіскап», «Беларусцы», іншыя творы. Але не ўсе бачылі вашы апавяданні, надрукаваныя ў расійскіх часопісах. Я знайшоў іх у інтэрнэце і чытаў з велізарным задавальненнем. Як вы ставіцеся да таго, што іншым разам іх параўноўваюць з апавяданнямі Шукшына пра «чудзікаў».***

— Паралель, канешне, не зусім карэктная, але ж я таксама чуў такое ад чытачоў. У любым горадзе, пасёлку, нават невялікай вёсцы заўсёды ёсць людзі, якія нечым выдзяляюцца. Нехта пачуццём гумару, нехта прыхільнасцю да моцных напояў, іншы — сваім лёсам. Ёсць такія персанажы і ў маім цыкле апавяданняў «Трэба цярпець». Жывуць яны і на роднай мне мсціслаўскай зямлі. Як я мог прайсці міма? Думаю, гэтак жа ставіўся да такіх людзей і Васіль Макаравіч Шукшын.

Але ёсць у гэтым цыкле апавяданні аб лёсах складаных, у прыватнасці апавяданне «Дом за ярам». Такія творы, магчыма, цяжка чытаць, але куды цяжэй жыць людзям з такім вось лёсам, як у майго героя, несправядліва абвінавачанага ў забойстве. Альбо гісторыя Мікіты Татарчонка (апавяданне «Пажар»), якога рэўнасць, дакладней, каханне прывялі да шэрагу злачынстваў.

Альбо герой апавядання «Трэба цярпець»: «...Была ў мяне ў вёсцы хатка, будка ў агародзе пад яблынькай, а ў будцы ляжачак жалезны. Я на яго паклаў дошкі, а на дошкі саломкі. Захочацца — лягу, пасплю. А яшчэ быў у мяне сабачка, харошы такі. Куды не пайду — ён са мной. Адпачыць лягу — і ён са мной. Вуха мне паліжа, нос. Харошае было жыццё». Але жыццё крута змянілася, калі старому давялося пераехаць у горад. «Не, паміраць не хачу. Пакуль пажыву, цікава мне... Трэба цярпець».

Якія тут «чудзікі»? Так што супастаўленне з Шукшыным — павярхоўнае.

***— Летась выйшла ваша дзіцячая кніжка «Вы яшчэ будзеце ганарыцца намі», якую вы падпісалі іншым імем — Алег Ждан-Пушкін. Чаму так? Чытачы ўжо прывыклі да літаратурнага прозвішча Ждан.***

— Усё проста. Гэта ўласнае ад нараджэння імя ніколі не надакучыць чалавеку і часцей за ўсё падабаецца яму да апошніх дзён. А псеўданім — Ждан — вельмі нават можа надакучыць. Ждан-Пушкін — родавае прозвішча майго дзеда, святара Іаана Канстанцінавіча, частку якога ён страціў адразу пасля рэвалюцыі. Вось я і скарыстаўся ёю.

**Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**

Запрашальнік

## МЕСЦА ДЛЯ ЭКСПЕРЫМЕНТАЎ...

**6 верасня ў Мінску стартавала свята непаслушэнства і разбурэння рамак — міжнародны фестываль «ПЕРФОРМЕНСК», зладжаны групай мастакоў з Беларусі, Чэхіі, Расіі і Славакіі. Мэта ўжо другога сезона праекта — прадставіць беларускай публіцы работы маладых незалежных творцаў, якія працуюць у жанры жывога мастацтва (эксперыментальнага тэатра, перформанса, саўнд-арту), а ім самім — даць магчымасць абмяняцца ідэямі, натхніцца і стварыць прастору для далейшага супрацоўніцтва.**

Фестываль разгарнуўся на некалькіх мінскіх пляцоўках: ва ўнутраных і знешніх прасторах музея-майстэрні Заіра Азгура і культурнага хаба ОК-16, дзе паралельна рэалізуюцца эксперыментальныя пастаноўкі і інсталяцыі. Асноўную праграму дапаўняюць мультымедыйныя спектаклі і перформансы малога фармату, выступленні гукавых мастакоў і музыкаў, а таксама адукацыйны блок.

Фармат «ПЕРФОРМЕНСКУ» — у адсутнасці фармату. Напрыклад, інтэрактыўная гульня ад Вялікага Цырка Няўдач дапускае ў пакой гледачоў толькі па адным, і кожнаму трэба прачытаць запіску са сваёй місіяй і самастойна разгадаць сакрэты тайнай суполкі. Лялечны аб'ектны монаспектакль «36 драматычных сітуацый» Ганны Раманавай, паказаны ў першы дзень фестывалю, камерны, ідзе ўсяго паўгадзіны і разлічаны максімум на 12 гледачоў. Затое праект «Фігуры», які сёння прадставіць у музеі-майстэрні Заіра Азгура хельсінкскае аб'яднанне кампазітараў і перформераў, уключае мноства дзеючых асоб і будзе доўжыцца ажно шэсць гадзін! Лекцыі, аўдыявізуальныя інсталяцыі, тэатралізаваная дзея пра апошні дзень на зямлі, нечаканыя лялечныя пастаноўкі і іншае мастацкае хуліганства, якое адбываецца перад гледачом проста тут і цяпер, завяршацца вялікім і шумным канцэртам. Словам, калі душа просіць не класічнага сямейна-выхаднога праменаду на відовішчнае мерапрыемства, а чагосьці такога, каб разгарнуцца і згарнуцца назад, — вам менавіта сюды.

## ...І ТЭАТРАЛЬНАГА ШМАТГАЛОССЯ

**З 8 да 15 верасня ў Брэсце 24-ы раз пройдзе адзін з найстарэйшых міжнародных тэатральных форумаў нашай краіны, фестываль «Белая вежа».**

«Сымона-музыку» і «Новую зямлю», «Вішнёвы сад» і «Дзядзьку Ваню», «Жоўты пясочак» і «Ганну Франк», «Пышку» і «Вія», а таксама іншыя драматычныя, лялечныя, пластычныя пастаноўкі будуць даваць тэатры з 13 краін. Агулам у праграме 28 спектакляў, якія пакажуць на пяці гарадскіх пляцоўках — на беларускай, рускай, украінскай, польскай, балгарскай, венгерскай, румынскай і грузінскай мовах.

Сёлета ў праграме два вулічныя спектаклі: у першы дзень фестывалю на плошчы Леніна свой «Карпацкі калейдаскоп» пакажа Львоўскі акадэмічны тэатр «Васкрэсіння», а ў апошні прадставіць сямейную пастаноўку «Каменны» тэатр «Сцэна калейдаскоп» (Кракаў, Польшча). Сярод іншых цікавінак «Белай вежы» — інклюзіўны аўдыятактыльны спектакль для дзяцей «Сябры Фядоры» (яго вязе Усходне-казахстанскі абласны драмтэатр), паэтычны монаспектакль Канстанціна Райкіна «Звычайныя словы» і балет «Стварэнне свету» ў пастаноўцы Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра класічнага балета Касаткінай і Васілёва. Дарэчы, гэты біблейскі сюжэт, аздоблены музыкай Андрэя Пятрова, з дня прэм'еры на працягу больш як 30 гадоў збірае выключна аншлагі!

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**